Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»
Кафедра славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі
Кафедра гісторыі Беларусі

# БЕЛАРУСЬ У ЭПОХУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ УЗРУШЭННЯЎ:

## *Да 100-годдзя выхаду ў свет газеты «Наша ніва»*

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*

г. Мінск, 10 лістапада 2006 г.

Мінск 2006

УДК 947.6
ББК 63.3 (4Беи)
Б43

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук
(пратакол № 8 ад 26.10.2006 г.)

***Рэдакцыйная калегія***:
кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры методыкі выкладання гісторыі БДПУ *І. І. Багдановіч*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко* (навук. рэд.);
доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М. М. Забаўскі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *Г. А. Космач*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А. М. Люты*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *М. К. Сакалоў*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У. В. Тугай*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В. М. Фамін*

***Рэцэнзент:***
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ *М. Я. Сяменчык*

Б43 **Беларусь** у эпоху рэвалюцыйных узрушэнняў: Да 100-годдзя выхаду ў свет газеты «Наша ніва»: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 10 лістап. 2006 г./ Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. І. І. Багдановіч [і інш.]; навук. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2006. – 149 с.
ISBN 985-501-146-5.

У зборніку разглядаюцца асноўныя пытанні беларускага перыядычнага друку пачатку XX ст. Асвятляюцца актуальныя праблемы гісторыі Беларусі перыяду капіталізму.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў і ўсім, хто цікавіцца гістарычнай навукай.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 985-501-146-5**

© БДПУ, 2006

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

# ПЕРШЫ ЛІСТАПАДАЎСКІ НУМАР "НАШАЙ НІВЫ" 1906 Г. (ДА 100-ГОДДЗЯ ВЫХАДУ ПЕРШАГА НУМАРА)

А.М. Люты г. Мінск, БДПУ

Аналіз першых лістападаўскіх нумароў не дае нам магчымасці акрэсліць усе задачы гэтага выдання. Браты І. і А. Луцкевічы, В. Іваноўскі, А. Уласаў, А. Пашкевіч (Цётка) і інш. лідэры Беларускай сацыялістычнай грамады (заснавальнікі першай штотыднёвай беларускай газеты з малюнкамі) планавалі разглядаць грамадска-палітычныя, навукова-асветніцкія і літаратурна-мастацкія пытанні беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Першы нумар быў выдадзены 10(23) лістапада 1906 г. у Вільні [11, с. 314]. Дзякуючы выдавецтву "Навука і тэхніка" НАН Беларусі, Міністэрству інфармацыі РБ і асабіста З.Ф. Салько ў 1992 г. убачыла свет факсімільнае выданне нумароў "Нашай нівы", якія захоўваліся не толькі ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі, але і ў прыватным кнігазборы Янкі Саломевіча, у Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва Беларусі, у Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М.Я. Салтыкова-Шчадрына (г. Санкт-Пецярбург), у Цэнтральнай бібліятэцы АН Літоўскай Рэспублікі, Урадавай бібліятэцы імя А.М. Горкага Савета Міністраў РБ і бібліятэцы Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі [8].

Мне хацелася б нагадаць уступны невялічкі артыкул, які быў змешчаны ў першым нумары "Нашай нівы". Рэдактар-выдавец С. Вольскі (З. Вольски) дае наступны тэкст: "Пачынаючы выдаваць беларускую газэту "Наша Нива", хочэм трохи пагаварыць з усими, каму у той чы иншы способ залежыць на нашай працы, хочэм адкрыць свае думки, каб усе магли нас пазнаць.

"Наша Нива" будзе другой беларускай газэтой – першая газэта «Наша Доля» не жывець: яна была надта нядоуго, блиснула як маланка и згинула гдзесьци. Разумеем, якую вяликую работу яна можэ зрабиць. И дзеля таго мы будзем старацца, каб наша газэтка заглянула усюды, каб папала яна и пад стрэху бедной курной хаты мужыка-беларуса. Не думайце, што мы хочам служыць тольки ци панам, ци адным мужыкам. Не николи не! Мы будзем служыць усему беларускаму скрыуджэнаму народу, пастараемся быць люстром жыцця, каб ад нас, як ад люстра, свет падау у цёмнасць… Мы будзем браць усё ад усих и, злажыушы у парадак, зноу аддаваць. Ведайце добра, што «Наша Нива», газэта не рэдакцыи, але усих беларусоу и усих тых, хто им спагадае. Кожны мае право быць выслуханым на страницах нашэй газэты и кераваць ёю, тольки каб было разумнее. Мы з сваей стараны будзем старацца, каб усе беларусы, што не ведаюць хто яны ёсць, - зразумели, что яны беларусы и людзи, каб пазнали свае права и памагли нам у нашай рабоци.

Ня будзем писаць громка. Будзем спакойне, цьверда кидаць усим прауду у вочы, пастараемся быць церпеливыми и панаваць над сабою: нехай халодны розум моцна трымае у сваих руках гарачэе сэрцэ…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А цяпер прызываем усих тых, хто разумее нашы цэли, адчувае тое, што мы чуем, захочэ нам памагчы:

Падтрымайце нас у рабоце, што цяпер пачынаецца!" [8, с. 1].

Паводле ацэнкі Віленскага ахоўнага аддзела "Наша ніва" была спачатку больш памяркоўная, чым "Наша доля", але пасля "стала змяшчаць артыкулы ўзбуджанага характару, за што падвяргалася некалькі разоў канфіскацыі" [11, с. 314].

Паставіўшы мэту служыць "усему беларускаму скрыўджанаму народу" кіраўнікі "Нашай нівы" хваляваліся перш за ўсё за лёс беларускай нацыі. Царскі ўрад, праваслаўная царква, рускія і польскія памешчыцка-клерыкальныя партыі і арганізацыі, афіцыйная школа і шавіністычны друк праводзілі актыўную дзейнасць, накіраваную на асіміляцыю беларускага народа [7, с. 429].

Першы лістападаўскі нумар 1906 г. сведчыць пра тое, што кіраўнікі "Нашай нівы" (галоўным чынам члены БСГ) выказвалі дробнабуржуазныя погляды нацыянальных партый леванародніцкага накірунку [3, с. 418]. Нават верш, які быў змешчаны ў першым нумары падцвярджае гэтую думку:

«...Мы слухаючы, вздыхаем
Да шчасливай доли,
Циха слёзы выцираем:
Цяжка жыць бяз воли!...»

З.К. [8, с. 2]

Кіраўнікі БСГ лічылі, што вырашэнне асноўных сацыяльна-эканамічных пытанняў адбудзецца не ў выніку рэвалюцыі, а праз дзейнасць Дзяржаўнай думы. Ужо ў першым нумары ад 10 (23) лістапада 1906 г. рэдакцыйны артыкул быў прысвечаны выбарам у Дзяржаўную думу.

У артыкуле адзначалася, што галоўнай мэтай "Нашай нівы" з'яўляецца пашырэнне адукацыі і навукі сярод "цёмнага нашага народу" і дзеля вырашэння гэтай мэты неабходна выкарыстаць магчымасці выбарнай Дзяржаўнай думы. Аўтары ідэалізавалі маніфест 17 кастрычніка 1905 г. царскага ўрада Расійскай імперыі. Праўда ў артыкуле ідзе гаворка і пра характар выбараў дэпутатаў, пра абмежаванні правоў і ліквідацыі права голасу "многіх мужыкоў ды работнікаў": страцілі права выбіраць дэпутатаў "вечные чиншэвики у губернях западных и нашых беларуских и тыя арэндатары (праваслауныя), "единоверцы", стараверы, каторых правицельство перэсяляло з Расеи и пасадзило на чужой зямли у беларуских и литоуских губернях. Страцило голас и шмат работникау па гарадох, напрыклад низшые служашчые на чугунцы" [8, с. 2-3]. Не атрымалі права голасу навучэнцы і студэнты з сялянскага салоўя. Аўтары артыкула заклікалі ўсіх працаўнікоў, якой бы веры яны не былі, аб'яднацца дзеля выбару сваіх дэпутатаў-заступнікаў, каб палепшыць сваё жыццё.

У артыкуле Мацея Крапіўкі "Як нам учыцца" выказваецца ідэя аб пераводзе навучэння ў Беларусі з "расейскай" на беларускую мову, аб адкрыцці беларускіх школ і напісанні беларускіх падручнікаў. Аўтар прывёў выказванне Мацея Бурачка, які лічыў, што нельга забываць родную мову, бо людзей можна пазнаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

"…ци па гаворцы, ци па адзежы, хто якую носиць; – отож гаворка, язык и есць адзежа душы" [8, с. 5].

У першым нумары "Нашай нівы" змешчаны здымак і невялічкі артыкул Шчаснага пра замчышча Навагрудка. У 1906 г. замчышча называлася Лішкоў Сейненскага павета Сувальскай губерніі. Аўтар апавядае, што гэта замчышча было збудавана на сыпанай горцы ў сярэдзіне XI ст. Яно, як піша Шчасны, належыла крывічанскім князям, а ў XIII ст. князь "Літвы и Белае-Руси" Міндоўг каранаваўся ў Навагрудку (Лішкове). Да XV ст. гэты гарадок Лішкаў, называўся Навагрудкам. Недалёка ад замчышча відаць руіны касцёла XV ст. [8, с. 5]. Вельмі к месту змешчаны тут і верш Якуба Коласа "Нёман" [8, с. 6].

На старонках першага нумара змяшчаліся звесткі крымінальнага характару, розныя навіны фінансавага характару, але галоўную ўвагу аўтары звярталі на праблемы адукацыі: аб дэпутацыі навучэнцаў маладзечненскай семінарыі з скаргай на дырэктара Гадыцкага-Цвірку да папячыцеля Віленскай акругі і ў Пецярбург, і аб стане адукацыі ў Расіі ўцэлым і ў Беларусі. Параўноўваючы ўзровень адукаванасці, прыведзены наступныя звесткі: у Японіі з 100 дзяцей вучацца 97 чалавек, а ў Мінскай губерніі, напрыклад, толькі 20 [8, с. 7].

Распавядаючы пра сацыяльную няроўнасць "Элька" ў артыкуле "Нявидзимые нашы вороги" піша, што калі ў аднаго ёсць шмат, а ў другога нічога, то трэба весці вайну, як гэта адбываецца ў прыродзе.

Падпіска на штотыднёвую беларускую газету "Наша ніва" прымалася ў Вільні,і выходзіла яна ў друкарні М. Кухты на вуліцы Дварцовай, д. 4. "рускими и польскими литэрами", іншымі словамі на беларускай мове кірыліцай да 18(31) лістапада 1912 г. і лацінкай [11, с. 314].

У далейшым "Наша ніва" агітавала не толькі за нацыянальнае адраджэнне і развіццё адукацыі, але і крытыкавала тагачасны грамадскі і дзяржаўны лад. Газета заклікала да барацьбы за поўную свабоду слова, друку, сходаў, саюзаў, забастовак [7, с. 420].

***Літаратура***

1. Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць. Мн., 1968.
2. Александровіч С. Пуцявіны роднага слова. Мн., 1971.
3. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Мн., 1972. Т. 2.
4. Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Беларуси. М., 1972.
5. Конан У.М. Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917–1934 гг.). Мн., 1968.
6. Конон В. Демократическая эстетика Белоруссии (1905–1917 гг.).
7. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч.. Мн., 1994. Ч. 1
8. Наша ніва. Факсімільнае выданне. Выпуск 1. 1906-1908. Мн., 1992.
9. Пуцявінамі Янкі Купалы: Дакументы і матэрыялы. Мн., 1981.
10. Семашкевіч Р. Выпрабаванне любоўю. Мн., 1982.
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1999. Т. 5.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ